Малявко Т.В., студент 430 группы заочной формы обучения

Научный руководитель – Романова Ж.Л

кандидат педагогических наук

# СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ФАРМІРАВАННЯ ЛІЧБАВЫХ КРАЯЗНАЎЧЫХ РЭСУРСАЎ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У ходзе аналізу сайтаў публічных бібліятэк Беларусі можна вылучыць некалькі асноўных падходаў прадстаўлення краязнаўчых матэрыялаў у лічбавым асяроддзі. Значная частка рэсурсаў рэалізавана ў выглядзе тэматычнага раздзелу сайта, падраздзелы якога ўтрымліваюць тэкставую, фактаграфічную і бібліяграфічную інфармацыю, а таксама графічныя матэрыялы [1].

Краязнаўчыя рэсурсы бібліятэк звычайна прадстаўлены ў лічбавым асяроддзі базамі даных (БД), электроннымі бібліятэкамі, віртуальнымі музеямі, паказальнікамі, энцыклапедыямі і асобнымі рэсурсамі разнастайнай тэматычнай накіраванасці.

Абласныя бібліятэкі рэспублікі з’яўляюцца асноўнымі цэнтрамі стварэння, захоўвання і прадастаўлення краязнаўчай інфармацыі ў сваіх рэгіёнах. З мэтай аб’яднання і сістэматызацыі звестак аб рэгіёне на адзінай інфармацыйнай платформе, абласныя бібліятэкі ствараюць карпаратыўныя лічбавыя краязнаўчыя рэсурсы, якія значна спрашчаюць пошук краязнаўчай інфармацыі і робяць доступ да яе хуткім і зручным для карыстальнікаў. Лідэрамі ў стварэнні такіх праектаў у краіне з’яўляюцца Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна і Гродненская абласная бібліятэка імя Я.Ф. Карскага.

У поўнатэкставой базе даных «Край мой - Магілёўшчына». Сабрана інфармацыя па гісторыі, культуры, прамысловасці, сельскай і іншым гаспадаркам горада Магілёва і Магілёўскай вобласці з часоў заснавання і па сённяшні дзень. У даведніку прадстаўлены інтэрактыўныя спасылкі (банеры)

на рэгіянальныя інтэрнэт-прадукты (базы дадзеных, віртуальныя праекты, персанальныя сайты пра знакамітых ураджэнцаў, «літаратурныя карты»), створаныя публічнымі бібліятэкамі Магілёўскай вобласці: Магілёўскай абласной бібліятэкай ім. У.і. Леніна, 21 раённай і 2 гарадскімі бібліятэчнымі сеткамі. Спасылкі забяспечаны кароткімі анатацыямі, якія раскрываюць змест інтэрнэт-праектаў. Ажыццяўляць пошук неабходнай інфармацыі можна двума спосабамі: па тэрытарыяльным прынцыпе, выбраўшы патрэбны раён, або з дапамогай тэматычнага рубрыкатара, які складаецца з 10 раздзелаў: «Гісторыя», «Летапіс вёскі», «Вялікая Айчынная вайна», «Вайна ў Афганістане», «Знакамітыя людзі», «Славутасці», «Літаратурнае краязнаўства”, «Культура і мастацтва», «Рэлігія», «Экалогія». Даведнік складаецца з **132** лічбавых краязнаўчых праектаў. Сярод раённых бібліятэчных сістэм Магілеўскай вобласці па стварэнні лічбавых краязнаўчых рэсурсаў лідыруюць ДУК «Белыніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сетка» – 15, ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Быхаўскага раёна» – 11, ДУК «Бібліятэчная сетка Крычаўскага раёна» -10 [4].

Даведнік па інтэрнэт-рэсурсах бібліятэк *«Краязнаўчы партал Гродзенскай вобласці»* створаны публічнымі бібліятэкамі Гродненскай вобласці: абласной бібліятэкай імя Я.Ф. Карскага, 17 раённымі бібліятэчнымі сістэмамі. Пошук неабходнай інфармацыі ажыццяўляецца двума спосабамі: па тэрытарыяльным прынцыпе, выбраўшы патрэбны рэгіён, або з дапамогай тэматычнага рубрыкатара, які складаецца з 6 раздзелаў: «Гісторыя. Падзеі. Факты», «Знакамітыя людзі», «Літаратурнае краязнаўства», «Спадчына», «Турызм», «Экалогія». Даведнік па інтэрнэт-рэсурсах бібліятэк «Краязнаўчы партал Гродзенскай вобласці» ўключае ў сябе **72** лічбавыя краязнаўчыя рэсурсы [3].

Сярод абласных бібліятэк краіны па стварэнні карпаратыўных лічбавых краязнаўчых рэсурсаў вылучаецца Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, якая стварыла сумесна з раённымі бібліятэчнымі сістэмамі камбінаваную базу даных краязнаўчай тэматыкі «Прыдзвінскі край: гісторыя

і сучаснасць». Гэта краязнаўчы інфармацыйны рэсурс, дзе прадстаўлена гісторыя, розныя галіны эканомікі і культурнага жыцця раёнаў Віцебскай вобласці. Уключаны звесткі пра вядомых ураджэнцаў краю. Матэрыялы рэсурсу згрупаваны па раёнах Віцебскай вобласці, унутры раёнаў па раздзелах: *«Візітная картка», «Гісторыя», «Прырода», «Эканоміка», «Медыцына», «Спартыўнае жыццё», «Культура», «Помнікі гісторыі і архітэктуры», «Легенды і паданні аб краі», «Вядомыя ўраджэнцы краю».* Матэрыялы да БД падрыхтаваны супрацоўнікамі цэнтральных бібліятэк раённых цэнтраў вобласці, апрацаваны і дапоўнены спецыялістамі абласной бібліятэкі [6].

Нацыянальная бібліятэка Беларусі, з’яўляецца цэнтрам краязнаўчай інфармацыі і крыніцай доступу да лічбавых краязнаўчых рэсурсаў рэспублікі. З гэтай мэтай створана *Віртуальная чытальная зала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі* (ВЧЗ НББ), якая прадстаўляе на сваёй пляцоўцы рэсурсы арганізацый-партнёраў. Віртуальная чытальная зала забяспечвае аддаленым карыстальнікам доступ да электронных інфармацыйных рэсурсаў (ЭІР): паўнатэкставых, рэфератыўных, бібліяграфічных і фактаграфічных баз дадзеных [7].

Больш за ўсё тут прадстаўлены рэсурсы публічных бібліятэк Магілёўскай вобласці – 57, рэгіён з’яўляецца лідарам па іх стварэнні. Далей ідуць: Брэсцкая – 23, Віцебская вобласць – 14, Гомельская – 12, Гродзенская – 9, Мінская – 3, і Мінск – 3.

***Табліца паказчыкаў рэгіянальных лічбавых краязнаўчых рэсурсах у ВЧЗ НББ***

| Рэгёны | Колькасць бібліятэк | У тым ліку цэнтральных раённых бібліятэк | Колькасць спасылак на рэсурсы | Колькасць спасылак на рэсурсы ЦРБ |
|---|---|---|---|---|
| Брэсцкая вобласць | 10 | 9 | 23 | 9 |
| Віцебская вобласць | 4 | 2 | 14 | 4 |
| Гомельская вобласць | 4 | 2 | 13 | 5 |
| Гродненская вобласць | 2 | 1 | 9 | 1 |
| Магілёўская вобласць | 13 | 11 | 57 | 43 |
| Мінская вобласць | 2 | 2 | 3 | 3 |
| УСЯГО | **35** | **27** | **119** | **65** |

Стварэнне карпаратыўных праектаў садзейнічае больш эфектыўнаму папаўненню ВЧЗ лічбавымі краязнаўчымі рэсурсамі. Ствараюцца карпаратыўныя праекты не толькі сярод бібліятэк, але абласныя бібліятэкі да супрацоўніцтва прыцягваюць разнастайныя арганізацыі. Адным з такіх праектаў лічыцца камбінаваная база даных краязнаўчай накіраванасці «Афганистан: без права на забвение». Над стварэннем дадзенага лічбавага прадукта працавалі ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Віцебская абласная арганізацыя ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», Віцебскі гарадскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Праект распрацаваны да 25-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана і прысвечаны воінам-афганцам Віцебшчыны.

Вынікам сумеснага праекта Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Ленінна і ГА «Беларускі саюз мастакоў» з’яўляецца мультымедыйная камбінаваная база даных краязнаўчай тэматыкі «Художники Витебщины». Аснову рэсурса складаюць матэрыялы пра жыццё і творчую дзейнасць жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога

мастацтва і інсталяцыі, якія з'яўляюцца членамі абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз мастакоў», а таксама мастацтвазнаўцаў і фотамастакоў [5].

Як паказвае аналіз сайтаў абласных бібліятэк краіны, дзейнасць па стварэнні карпаратыўных лічбавых краязнаўчых бібліятэчных праектаў у рэспубліцы ў розных рэгіёнах знаходзіцца на розных узроўнях і лідыруючае месца займае Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна. Сярод створаных бібліятэкай **25** лічбавых краязнаўчых рэсурсаў, **6** з іх з’яўляюцца карпаратыўнымі.

Гомельская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна стварыла інфармацыйна-бібліятэчны партал, дзе прадстаўлены 11 поўнатэкставых баз дадзеных, сярод якіх *«Гомельскі рэгіён», «Гомельшчына літаратурная», «Знакамітыя людзі Гомельшчыны», «Помнікі Гомельшчыны»* і г.д., але не адзін з іх не адзначаны, як карпаратыўны праект і спасылкі на сайты раённых бібліятэк адсутнічаюць. Гомельская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна займаецца стварэннем краязнаўчых баз даных, выкарыстоўваючы матэрыялы сваіх архіваў, не задзейнічаючы архіўныя матэрыялы раённых бібліятэк [2].

На сайце Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна ў раздзеле «Краязнаўчы цэнтр» прадстаўлена карпаратыўная база даных *«Электронныя інфармацыйныя рэсурсы»*, які складаецца з васьмі рубрык *«Знакамітыя людзі», «Славутасці», «Літаратурнае краязнаўства», «Рэлігія»* і г.д. Напаўняльнасць краязнаўчымі матэрыяламі дадзеных рубрык не задаволіць попыт карыстальнікаў, так як некаторыя з іх зусім не запоўнены (рубрыка «Рэлігія»). У рубрыцы «Экалогія» прадстаўлены адзін лічбавы рэсурс – «Мядзельшчына – край блакітных азёр», але адсутнічае спасылка на гэты рэсурс. Толькі ўказана, што рэсурс даступны лакальна ў ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка». Прадстаўленне матэрыялу ў такім выглядзе выклікае нязручнасці для карыстальнікаў і робіць лічбавы краязнаўчы рэсурс не эфектным і не якасным [8].

Разам са станоўчымі прыкладамі стварэння краязнаўчых баз даных уласнай генерацыі, прыклады неякаснага стварэння лічбавых краязнаўчых

рэсурсаў (калі спасылкі на рэсурс раённай бібліятэкі адсутнічаюць альбо, наогул, пры пераходзе па спасылцы, адсутнічае якая-небудзь інфармацыя), на жаль, маюць месца ў бібліятэчнай практыцы. Абласным і раённым бібліятэкам ёсць над чым працаваць у гэтым накірунку. Да таго, адзіная кропка доступу ў ВЧЗ не забяспечвае паўнату дадзеных. Наяўнасць такіх праблем абумоўлена абмежаванымі матэрыяльнымі магчымасямі большасці бібліятэк, недастатковай падрыхтаванасцю супрацоўнікаў да працы з новымі тэхналогіямі, неабходнасцю прафесійнага выбару і асваення праграмных сродкаў. Усе гэтыя фактары негатыўна ўплываюць на якасць краязнаўчых рэсурсаў у лічбавым асяроддзі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Долгополова, Е. Краеведческие ресурсы публичных библиотек в сети Интернет: размышления пользователя / Е.Е. Долгополова /Бібліятэчны свет, 2021.—№1, С.14—16.
2. Інфармацыйна-бібліятэчны партал Гомельскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна [Электронны рэсурс].- Рэжым доступу: https://goub.by/?page_id=23865 .- Дата доступу: 19.11.2022.
3. Краязнаўчы партал Гродзенскай вобласці [Электронны рэсурс] / Даведнік інтэрнэт-рэсурсаў бібліятэк рэгіёну Гродненскай абласной бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага.- Рэжым доступу: http://krai.grodnolib.by/ .- Дата доступу16.11.2022.
4. Край мой - Магілёўшчына [Электронны рэсурс] / Віртуальныя праекты Магілёўскай абласной бібліятэкі ім. У.І. Леніна.- Рэжым доступу: http://catalog.library.mogilev.by/kray/index.html .- Дата доступу15.11.2022.
5. Мастакі Віцебшчыны [Электронны рэсурс] /База даных уласнай генерацыі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна.- Рэжым доступу: http://www.vlib.by/index.php/ru/2019-07-16-08-23-06/bazy-dannykh .- Дата доступу: 19.11.2022.

6. Прыдзвінінскі край: гісторыя і сучаснасць [Электронны рэсурс] / Базы даных уласнай генерацыі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна.- Рэжым доступу: http://pridvinie.vlib.by/ .- Дата доступу17.11.2022.

7. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі [Электронны рэсурс] / Рэсурсы арганізацый-партнёраў нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.- Рэжым доступу: https://www.nlb.by/content/uslugi/virtualnye-servisy/virtualnyy-chitalnyy-zal/ .- Дата доступу: 19.11.2022.

8. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С.Пушкіна [Электронны рэсурс].- Рэжым доступу: http://pushlib.org.by/node/2174 .- Дата доступу: 19.11.2022.

Маргевич Я.Д., студент 402 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Петушко Н.Е.,
кандидат педагогических наук, доцент

## ПРАКТИКА РЕАЛИЗАЦИИ ГАСТРОНОМИЧЕСКИХ ФЕСТИВАЛЕЙ: ОТЕЧЕСТВЕННЫЙ И ЗАРУБЕЖНЫЙ ОПЫТ

Истоки фестивального движения восходят к древности, к тому времени, когда проходили фесты и ярмарки. Уже в то время закладывался основной их функционал – соединение участников для общения на фоне демонстрации творческих достижений, а также осмысление и восприятие духовных ценностей. Свои современные черты фестиваль приобрел к концу XX в., когда началось становление и развитие культурных связей между странами.

Термин «фестиваль» происходит от латинского слова «festivus» – «веселый, праздничный». Существует ряд определений понятия «фестиваль». Интерпретируя различные точки зрения, можно выразить сущность и основное содержание фестиваля как «организация массового тематического